— Пазакласная работа.

— Удзел у пасяджэннях педсавета і прадметна-метадычных камісій.

— Якія цяжкасці зведаў у ходзе практыкі?

Вывады, прапановы па ўдасканальванні падрыхтоўкі студэнтаў да работы ў школе, арганізацыі практыкі, пажаданні на будучае абавязковыя ў гэтай справаздачы.

З мэтай павышэння эфектыўнасці праходжання педагагічнай практыкі студэнтаў належыць увесці дыферэнцыраваны залік у VII і VIII семестрах і экзамен у IX семестры, таму што ўсе студэнты атрымліваюць кваліфікацыю выкладчыкаў па спецінструменце.

**У.І.Бялоў,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## РАЗВІЦЦЁ ПРАФЕСІЙНЫХ УМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ СТУДЭНТАЎ III КУРСА Ў ЧАС ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

На працягу пяці семестраў навучання студэнты спецыялізацыі "сацыяльны педагог" засвойвалі веды па шэрагу творчых дысцыплін. Гэта — драматургія і рэжысура культурна-адпачынкавых праграм, мастацтва слова, гульнявая дзейнасць, рэкрэацыйная дзейнасць.

Атрыманыя па гэтых і іншых дысцыплінах веды студэнты замацоўваюць ў ходзе вытворчай практыкі на трэцім курсе. Практыка з'яўляецца трэнінгам для адпрацоўкі:

— уменняў ажыццяўляць пастаноўку культурна-адпачынкавых праграм;

— развіцця арганізатарскіх навыкаў;

— уменняў улічваць узроставыя асаблівасці аўдыторыі.

Базамі практыкі з'яўляюцца палацы, Дамы культуры, клубы, маладзёжныя цэнтры, кінатэатры і інш.

Як жа замацоўваюцца студэнтамі атрыманыя веды і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўменні на гэтых базах? Мы прааналізавалі вынікі практыкі студэнтаў 312-й групы спецыялізацыі "сацыяльны педагог" (справаздачы, дзённікі, характарыстыкі, водгукі на мерапрыемствы).

Аналіз характарыстык студэнтаў, атрыманых на базах практыкі, даў магчымасць намаляваць сукупны партрэт спецыяліста, які мае характэрныя рысы: актыўны, ініцыятыўны, камунікабельны, творчы, адказна падыходзіць да справы, дысцыплінаваны, мае прафесійныя навыкі і арганізатарскія здольнасці, на прафесійным узроўні выконвае абавязкі і г.д. Атрымліваецца вельмі добрая характарыстыка спецыяліста з канкрэтнымі прафесійнымі якасцямі, здольнага ажыццяўляць творчую работу. У ходзе практыкі студэнты паспяхова працавалі над пастаноўкай шэрага гульнявых праграм ("У свеце казкі", "У краіне школьных талентаў"); эстрадна-гульнявой праграмы "Давайце знаёміцца"; тэматычнага вечара "Незабыўныя гады"; вечара сямейнага адпачынку "Вясновыя мелодыі"; выпускнога балю.

Яны прымалі ўдзел у падрыхтоўцы мітынгу-рэквіема, свята "Гуканне вясны", культурна-спартыўнага свята.

Студэнты атрымалі водгукі на шэраг праведзеных культурна-адпачынкавых праграм. Так, напрыклад, у водгуку на тэматычны вечар "Незабыўныя гады", які праводзіла студэнтка Радзевіч Таісія, ёсць такая адзнака: "Сцэнарый вечара арыгінальны, рэжысёрскае рашэнне тэмы вельмі цікавае, музычны і паэтычны матэрыял адлюстроўвае змест пастаноўкі, а конкурсныя элементы актывізуюць аўдыторыю."

У водгуку на вечар сямейнага адпачынку "Вясновыя мелодыі", які рыхтавала студэнтка Карачкіна Марыя, было падкрэслена наступнае: "Вечар прайшоў цікава, на добрым эмацыянальным узроўні. Вельмі задаволены былі і бацькі, і дзеці. Вядучыя ўмела кіравалі аўдыторыяй і стварылі атмасферу ўзаемаразумення паміж дзецьмі і бацькамі".

Такім чынам, можна канстатаваць, што студэнты трэцяга курса не толькі замацавалі веды і ўменні; яны пашырылі свае творчыя магчымасці ў практычнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ